Вандруем па музеі пад адкрытым небам

СТАР 3

Ці варта працаваць у дэкрэце?

СТАР 5

Кузьма Кісялёў. Прыроджаны дыпламат

СТАР 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЛІСТАПАДА 2013 г. АЎТОРАК № 217 (27582) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРАВЕРКА НА БОЕГАТОЎНАСЦЬ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з арганізацыяй нясення баявога дзяжурства ў 61-й знішчальнай авіяцыйнай базе Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны, з асаблівасцямі выканання задач дзяжурнымі разлікамі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У час наведвання Прэзідэнту Беларусі было даложана аб арганізацыі баявога дзяжурства ва Узброеных Сілах, перспектывах будаўніцтва і развіцця ВПС і войскаў ППА, парадку нясення баявога дзяжурства па ППА ў авіяцыйнай базе. Кіраўнік дзяржавы наведаў месца нясення службы дзяжурных экіпажаў, праверыў гатоўнасць дзяжурнага экіпажа да выканання задач баявога дзяжурства.

Дзяжурнаму звяну была дадзена каманда «паветра», пасля чаго дзяжурны экіпаж падрыхтаваў самалёт МіГ-29 да выканання пастаўленых задач, якія былі рэалізаваны ва ўстаноўлены час. Тэхнічны персанал выканаў усе дзеянні па падрыхтоўцы самалёта да вылету, лётчык запусціў рухавік і прадэманстраваў гатоўнасць да вырашэння задач.

Далей кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з узорамі ўзбраення і ваеннай тэхнікі, якая знаходзіцца на ўзбраенні беларускай арміі. Прэзідэнту далажылі аб стане, перспектывах развіцця і ўтрымання ўзбраення і ваеннай тэхнікі ВПС і войскаў ППА, разведкі, радыёэлектроннай барацьбы, сувязі і навігацыі.

Паколькі важным напрамкам развіцця Узброеных Сіл з'яўляецца больш шырокае выкарыстанне беспілотных лятальных комплексаў, Прэзідэнту былі прадэманстраваны беспілотныя комплексы, якія ўжо знаходзяцца на ўзбраенні, а таксама беспілотныя лятальныя комплексы беларускай вытворчасці. Прадстаўнікі галоўнага штаба ВПС і войскаў ППА, ваенна-прамысловага комплексу расказалі аб тактыка-тэхнічных характарыстыках прадстаўленых узораў беспілотных лятальных апаратаў і магчымасцях іх прымянення.

Кіраўніку дзяржавы было даложана аб стане і перспектывах развіцця тэхнікі разведкі, радыёэлектроннай барацьбы, навігацыйна-тапаграфічнай тэхнікі і тэхнікі сувязі.

Фінальным пунктам праграмы наведвання стала нарада.

Узброеныя Сілы Беларусі ў бліжэйшы час будуць праверены на боегатоўнасць, заявіў Аляксандр Лукашэнка, падводзячы вынікі наведвання 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ў ходзе наведвання брыгады праверыў гатоўнасць дзяжурных экіпажаў да выканання баявога дзяжурства. «Я хацеў праверыць, ці паказуха гэта падрыхтаваць дзяжурныя самалёты да вылету. Як аказалася, шэсць з паловай хвілін — і самалёт быў ужо на ўзлёце», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым, паводле яго слоў, у Расіі на гэтыя ж дзеянні адводзіцца 18 хвілін, ва Украіне, Польшчы — каля 15 хвілін.

Прэзідэнт таксама азнаёміўся з лінейкай вырабляемай тэхнікі. «Мы ў Беларусі ўсё ж умеем тэхніку рабіць. І калі нават не вырабляць, то аднаўляць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, цяпер шмат дзяржаў у свеце займаюцца мадэрнізацыяй і аднаўленнем ваеннай тэхнікі, паколькі яе закупка — гэта вельмі дорага. «Напрыклад, танк Т-72 — добры танк, які яшчэ выкарыстоўваецца і доўга будзе выкарыстоўвацца. Навошта новы купляць, калі можна аднавіць і мадэрнізаваць? Мы ўсё гэта ўмеем рабіць у Беларусі. У нас ёсць завод у добрым стане. Мы можам мадэрнізаваць самалёты, верталёты. Таму яны тут у лінейцы прадстаўленай тэхнікі», — падкрэсліў Прэзідэнт. Што датычыцца сродкаў ведкі, сувязі, гэта вытворчасць суперсучасных сістэм, якая наладжана ў Беларусі.

На думку Прэзідэнта, перспектыва — гэта беспілотныя лятальныя апараты. «Мы гэта асвоілі ў сябе», — удакладніў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама расказаў: «Сёння мы вызначаліся, колькі павінна быць ваенных гарадкоў (сёння іх каля 250), колькі павінна быць такіх баз, як гэта». «Мы ў палявых умовах паспрабавалі кінуць позірк на нашу армію і якой яна павінна быць заўтра, якая цана пытання. І практычна мы прынялі рашэнне, за выключэннем некалькіх нюансаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама заклікаў не спяшацца з вывадам самалётаў Су-27 са складу ВПС Беларусі. Прэзідэнт выказаў думку, што, зыходзячы з вопыту войнаў краін арабскай дугі, не трэба спяшацца выводзіць з сістэмы абароны Беларусі некаторыя віды тэхнікі. «Дапусцім, ці патрэбны нам Су-27 — магутны дарагі самалёт? Я выказаўся за тое, што нам трэба падумаць і ўсё ж такі захаваць гэтыя самалёты на нейкі, дапусцім, пагражальны перыяд, як бы дорага гэта ні было», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

ЗА БЕЗДАКОРНУЮ СЛУЖБУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка за ўзорнае выкананне службовых абавязкаў узнагародзіў медалём «За бездакорную службу» I, II, III ступені ваеннаслужачых, супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 18 лістапада, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

У прыватнасці, медаля «За бездакорную службу» I ступені ўдастоены палкоўнікі Андрэй Гурцэвіч, Васіль Данільчык, Уладзімір Дзмітрук, Сяргей Карнееў, Алег Літавор, Андрэй Мурашоў, Аляксандр Самовіч, Віктар Шумскі, падпалкоўнік унутранай службы Эдуард Фурс.

СТАРЫКІ: ВЁСКА НА АДНОЙ ЛАЎЦЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У вёсцы Старыкі Браслаўскага раёна некалі было сем дамоў. А сёння засталіся толькі два, і цяпер гэты населены пункт больш нагадвае хутар, чым пасёлак. Усіх жыхароў тут толькі чацвёра, і на адной лаўцы ім ужо не цесна. Нават калі Уладзімір Аўсюкевіч бярэ яшчэ ў рукі свой вялікі чырвоны баян (на фотаздымку), месца таксама хапае.

— Мы тут нібы адна сям'я, — кажа старэйшая за ўсіх Эмілія Гарбар, — дзяліць нам няма чаго. Вядома, мы пенсіянеры і жывём па-старэчы. Калі ёсць вольны час, чаму б не пасядзець разам, не паспяваць?!.

СТАР 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЯКАБСОН, старшыня Камітэта дзяржкантролю:

«Органы мясцовага кіравання нясуць адказнасць за парадак на тэрыторыі прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў рэгіёне, а таксама за рэалізацыю на іх інвестпраектаў. Работа па навядзенні парадку павінна праводзіцца сістэмна. Гэтаму пытанню трэба больш увагі надаваць санітарным і пажарным службам, прыродаахоўным ведамствам. А на чале ўсяго павінны стаяць органы мясцовай улады, якія, па-першае, маюць дастатковыя паўнамоцтвы, а па-другое, нясуць адказнасць за парадак на даручанай тэрыторыі, што прапісана ў адпаведных заканадаўчых актах».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.11.2013 г.

Долар ЗША	9280,00	▲
Еўра	12520,00	▲
Рас. руб.	285,00	▲
Укр. грыўня	1130,88	▲

ДЭПУТАТЫ ЗАЦВЕРДЗІЛІ СЯМЁНА ШАПІРУ ГУБЕРНАТАРАМ МІНШЧЫНЫ

На пазачарговай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Сямён Шапіра зацверджаны старшынёй Мінскага аблвыканкама. Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на новай пасадзе Сямёна Шапіру прадставіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч.

Як адзначыў прэм'ер-міністр, кіраўнік дзяржавы плануе праз месяц-другі сустрэцца з актывам вобласці, паставіць дадатковыя задачы перад аблвыканкамам і яго старшынёй, старшынямі гар- і райвыканкамаў, адпаведнымі ўпраўленнямі і аддзеламі. «Адбудзецца сур'ёзная размова, да якой трэба дастаткова адказна рыхтавацца. Гэта амаль завяршэнне года, і важна, з якім настроем, якімі планамі Мінская вобласць уступае ў 2014 год», — канстатаваў прэм'ер-міністр.

Міхаіл Мясніковіч ахарактарызаваў Сямёна Шапіру як вядомага ў рэспубліцы чалавека, які з'яўляецца дзяржаўным і грамадскім дзеячам, прафесіяналам вышэйшага ўзроўню. Сямён Барысавіч прайшоў усе прыступкі прафесійнай лесвіцы: ад галоўнага спецыяліста, кіраўніка буйнога аграпрамысловага прадпрыемства да міністра сельскай гаспадаркі і харчавання. Ён паспяхова працаваў старшынёй Гродзенскага аблвыканкама, з'яўляецца членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. «Нам добра вядомы стыль яго работы: станаўленне яго як кіраўніка праходзіла ў асноўным на Міншчыне. Упэўнены, што для кіруючых работнікаў вобласці гэта свой чалавек. Яму не патрабуецца шмат часу, каб увайсці ў курс справы, а вам, каб лепш даведацца пра яго», — сказаў Старшыня Савета Міністраў.

Міхаіл Мясніковіч паставіў перад кіраўніцтвам вобласці задачы, што выцякаюць з даручэнняў Прэзідэнта. Мінская вобласць — асобы рэгіён. Яе ўдзельная вага ў валавым унутраным прадукце Беларусі складае амаль 14%, у экспарце — 20%, у валавой вытворчасці сельгаспрадукцыі — 24%. Па ўзроўні атрыманай выручкі на аднаго работніка Міншчына займае першае месца сярод рэгіёнаў Беларусі. Дынаміка развіцця вобласці вельмі ўплывае на эканоміку краіны. «Таму ва ўсіх кадраў павінна быць абвостранае пачуццё адказнасці за даручаную справу», — упэўнены прэм'ер-міністр.

Фота БЕЛТА.

Мінская вобласць — лідар па прыцягненні прамых замежных інвестыцый сярод іншых абласцей краіны, у дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Менавіта тут узніклі і рэалізуюцца многія знакавыя інвестыцыйныя праекты, якія ў перспектыве будуць вызначаць далейшае развіццё эканомікі.

СТАР 2

БІЗНЕС НЕ БЕЗ «ВЫТАНЧАНАСЦЯЎ»

Як развіваецца Еўразійская эканамічная супольнасць? Якія вынікі дало вымярэнне індэкса «DOING BUSINESS-2014»? Ці ўлічылі голас бізнесу пры фарміраванні падаткаў на будучы год? На гэтыя і іншыя пытанні прадстаўнікі беларускага бізнесу шукалі адказы падчас пасяджэння Камітэта па прадпрымальніцтве канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў.

Еўразійская эканамічная супольнасць арыентуе кожнага з яе ўдзельнікаў на рынкі з 5-мільярдным насельніцтвам. Удзел Беларусі ў гэтым аб'яднанні патрабуе ад яе эканамічнай гнуткасці і адкрытасці да змен. Да гэтага часу Беларусь не мае незалежнага антыманапольнага заканадаўства, якое не падпарадкоўваецца ўраду. У гэтым яна саступае сваім партнёрам — Расіі і Казахстану. Менавіта таму Беларусі рэкамендавана аператыўна прывесці заканадаўства краіны ў адпаведнасць з адзінымі прынцыпамі і правіламі канкурэнцыі, рэгламентаванымі пагадненнем ад 9 снежня 2010 года. Таксама на эканамічнай прасторы рэспублікі не праводзяцца даследаванні аб канкурэнцыі на рынках, не хапае статыстычнай інфармацыі аб тым, што на іх адбываецца. «У гэтым Беларусь пакуль адстае, — падсумаваў складнікі праблемы **намеснік старшыні Беларускай канфедэрацыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў (наймальнікаў) Уладзімір КАРАГІН**. — Па ўсіх індыкатарах Давоскага форуму Беларусь знаходзіцца на 93-м месцы ў рэйтынгу (усяго прадстаўлена 141 краіна) па канкурэнтаздольнасці рынку».

Наколькі пазітыўна выглядае індэкс дзелавога аптымізму ў 2013 годзе? Паводле рэпрэзентатыўнага апытання 526 уладальнікаў бізнесу, ён мае наступныя значэнні. Суб'ектыўнае ўспрыманне толькі 11,6% бізнесменаў-рэспандэнтаў адзначыла паляпшэнне стану беларускай эканомікі. Калі казаць пра паказчыкі індэкса лёгкасці вядзення бізнесу «DOING BUSINESS-2014», то тут яны маюць зусім іншыя вынікі. Напрыклад, у катэгорыі «Адкрыццё бізнесу» Беларусь знаходзіцца на 15 месцы са 189, хаця лепшым паказчыкам было 7-е, у рэгістрацыі ўласнасці — на 3-м. Дарэчы, Беларусь увайшла ў тройку лідараў свету па хуткасці пераадолення адлегласці паміж развітымі эканомікамі і тымі, якія развіваюцца. Сёння актыўна закладваецца фундамент «дома-бізнесу» ў Беларусі, яго будуюць і ўмацоўваюць.

СТАР 2

НАДВОР'Е

ДАЖДЖЫ, АЛЕ ЦЁПЛА...

У аўторак тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў ускраіны антыцыклону, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Пры павышаным фоне атмасфернага ціску істотных ападкаў не будзе. Удзень часам чакаецца моцны паўднёвы вецер, парывамі месцамі да 15-17 м/с. Максімальная тэмпература паветра ад 2 цяпла па поўначы да плюс 8 градусаў па поўдні Беларусі. А вось у сераду атмасферны ціск пачне падаць. У многіх раёнах будуць ісці дажджы. Тэмпература паветра ў ноч на сераду ад 0 плюс 6 градусаў, удзень — 4—9 цяпла. Больш сур'ёзныя дажджы прагназуюць сіноптыкі ў чацвер, калі чарговы атмасферны фронт наблізіцца да нас з боку паўднёва-заходняй Еўропы. Стане яшчэ цяплей. Уначы стане ўжо 1—7 цяпла, а ўдзень — плюс 4—9 градусаў. І ў пятніцу чакаецца паніжаны атмасферны фон. Часам будуць ісці невялікія дажджы, у асобных раёнах — туман. Мінімальная тэмпература паветра ў ноч на пятніцу 0—плюс 6 градусаў, пры праясненнях да мінус 2 градусаў; удзень — 3—9 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГРУПА «ОНЭКСИМ» НАБЫВАЕ 21,75% АКЦЫЙ «УРАЛКАЛІЯ»

Група «ОНЭКСИМ» дамовілася аб куплі 21,75% акцый таварыства «Уралкалій», якія належаць структурам SuleymanKerimovFoundation. Бакі плануюць завершыць здзелку ў самы бліжэйшы час, паведамляецца на афіцыйным сайце інвестара. Здзелка не патрабуе дазволу рэгулятарных органаў. Сума здзелкі па дамове бакоў не абнародуецца.

ПЯЦЬ ВЕРСІЙ ЗА ВЫКЛЮЧЭННЕМ ТЭРАКТУ

Следства разглядае пяць версій крушэння пасажырскага самалёта Boeing 737 у Казані, і пакуль усе яны маюць права на існаванне, тэракт выключаны, заявіў журналістам міністр транспарту РФ Максім Сакалоў. «Да таго часу, пакуль Міждзяржаўны авіяцыйны камітэт не завершыць сваю работу, я думаю, што гэтыя пяць версій маюць права на жыццё і далейшую распрацоўку. Гэта і памылка пілатавання, і тэхнічная няспраўнасць самалёта, і няякаснае паліва, праца наземных службаў і ўмовы надвор'я», — сказаў Сакалоў.

Пасажырскі самалёт Boeing 737 авіякампаніі «Татарстан» у нядзелю разбіўся падчас пасадкі ў аэрапорце Казані. Загінулі шэсць членаў экіпажа і 44 пасажыры. Сярод ахвяр катастрофы — сын прэзідэнта Татарстана і кіраўнік упраўлення ФСБ па гэтай краіне.

ПАЛІЦЫЯ ЎЗЯЛА ПАД АХОВУ ЎСЕ ПАРЫЖСКІЯ РЭДАКЦЫІ

Парыжская паліцыя днём 18 лістапада ўзяла пад узмоцненую ахову рэдакцыі ўсіх мясцовых СМІ. Кіраўніцтва паліцыі прыняло адпаведнае рашэнне пасля другога за тыдзень нападу на журналістаў. Па інфармацыі Le Figaro, расследаваннем інцыдэнтаў у рэдакцыях тэлестанцыі BFM TV і газеты Liberation заняўся крымінальны аддзел парыжскай паліцыі. Як паведамлялася раней, у мінулую пятніцу ў офісе тэлеканала з'явіўся ўзброены стрэльбай мужчына, які вёў сябе неадэкватна і пагражаў журналістам. Ён зрабіў два стрэлы ў столь, заявіў, што «ў наступны раз не прамахнецца», і знік. Раніцай 18 лістапада, як мяркуецца, той жа мужчына з'явіўся ў рэдакцыю газеты, зрабіў два стрэлы, якімі параніў у шыю і жывот фатографа выдання. І на гэты раз яму таксама ўдалося пакінуць месца здарэння.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 13217

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

СПІС НЕБЯСПЕЧНЫХ ПРАДУКТАЎ ПАШЫРЫЎСЯ

Упраўленне па харчаванні і медыкаментах ЗША выпусціла дырэктывы, якія заклікаюць скараціць аб'ём спажывання акрыламіду з прадуктамі харчавання. Як паказалі даследаванні, гэта злучэнне, адкрытае толькі ў 2002 годзе, правакуе рак у жывёл. І ёсць падставы меркаваць, што яно небяспечна і для людзей. Такім чынам, акрыламід утвараецца пераважна ў прадуктах расліннага паходжання пры высокатэмпературнай апрацоўцы — запяканні і абсмажванні. Эксперты прапануюць выключыць з рацыёну бульбу, крупы, каву, крэкеры або хлеб, сухафрукты. Злучэнне ўтвараецца з цукроў і амінакіслот, якія змяшчаюцца ў гэтых прадуктах. Яго амаль няма ў малочных прадуктах, мясе і рыбе. Непрацяглая тэрмічная апрацоўка, у прынцыпе, няшкодная. А вось доўгая гатоўка пры высокай тэмпературы спрыяе павышэнню ўзроўню небяспечнага злучэння. Любы падгарэлы прадукт ці прадукт са скарыначкай небяспечны.

КОРАТКА

З мінскіх двароў да зімы павінны быць вывезены ўсе неэксплуатуемыя аўтамабілі. Такое даручэнне даў старшыня Мінскага гарвыканкама Мікалай Ладуцька.

Кірмаш інавацыйных ідэй-2013 пройдзе 20 лістапада ў Мінску. Для ўдзелу ў кірмашы адабраны 89 інавацыйных праектаў у сферы АПК, машынабудавання, аховы здароўя, энергазбераження, будаўніцтва.

У РНПЦ «Маці і дзіця» ўкараняецца новы метад даследавання кішэчніка ў дзяцей з дапамогай капсульной эндаскапіі. Гэта новы метад дыягностыкі захворванняў страўнікава-кішачнага тракта пры дапамозе мініяцюрнай відэакапсулы. Механізм уяўляе сабой капсулу з убудаванай відэакамерай і перадаючую прыладу — партатыўны камп'ютар, на які запісваюцца здымкі.

Беларускі баксёр-прафесіянал Сяргей Рабчанка чацвёрты раз абараніў тытул чэмпіёна Еўропы па версіі Еўрапейскага баксёрскага саюза (EBU) і ўладальніка пояса WBC Silver у малодшай сярэдняй вазе (да 69,9 кг), атрымаўшы перамогу над прадстаўніком Уэльса Брэдлі Прайсам.

НА КІРМАШЫ — РЫБА АД ДУШЫ

Здаўна бытуе народны выраз: «людзі ходзяць на кірмаш, каб на іншых паглядзець і сябе паказаць». Рыбаводы з рыбгаса «Палессе» Пінскага раёна, каб сябе паказаць, прывезлі на сталічны кірмаш сажалкавага таўсталобіка, шчупакоў і амураў вагой ад пяці да пятнаццаці(!) кіло. І рыбам экзатычных памераў, што цікава, не давялося доўга залежвацца. Вадзіцелю і адначасова сарціроўшчыку рыбы Івану Чабанюку (на фотаздымку) даводзілася раз-пораз адносіць жывы тавар «Палесся» да аўтамабіляў пакупнікоў.

СТАР 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.